■ Зусім сакрэтна

# «МНЕ ХАЦЕЛАСЯ ЎЧАПІЦЦА ЗА КАНЯ, І ХАЙ БЫ ЁН МЯНЕ ЗАБІЎ»...

## Што ў пачатку 1930-х стала прычынай антыкалгаснага руху

**У вёсцы Белева Петрыкаўскага раёна 25 лютага 1930 года жанчыны сабраліся натоўпам на вуліцы і запатрабавалі роспуску калгасаў, вяртання абагульненай маёмасці і насення. На наступны дзень узламалі замок склада з інвентаром і разабралі плугі і іншыя прылады. А 1 сакавіка калгасніцы прыйшлі да насеннага сховішча і запатрабавалі аддаць насенне. Калі ім адмовілі, сталі самі рассыпаць яго па мяхах...**

### ЛЕПШ ЗНІШЧЫЦЬ, ЧЫМ АБАГУЛЬНІЦЬ

Падобных выпадкаў па БССР ды і ўсім Саюзе было шмат, бо краіну ахапіў харчовы крызіс. У той жа час пры цэнтральных газетах ствараліся спецыяльныя літбрыгады, якія павінны былі прапагандаваць на сваіх старонках працу ўдарнікаў і ачарняць прагульшчыкаў і лайдакоў. Аднак у большасці выпадкаў усхваленне поспехаў у калгасах было раздзьмутым. Ды і на фоне ўвядзення картачнай сістэмы на хлеб у гарадах і галоднай смерці тысяч людзей у вёсках яны выглядалі здзекліва і непраўдападобна. А тут яшчэ сялянам забаранілі прадаваць хлеб, пакуль яны не выканаюць хлебанарыхтоўчы план. Але чаканага эфекту гэта не атрымала: на базарах вёўся актыўны гандаль хлебам і мукой, а планы не былі выкананы і напалову. Квітнелі хлебныя спекуляцыі, з'явілася мноства перакупшчыкаў. Тады ўрад пайшоў на больш жорсткія меры: мясцовым органам ДПУ далі ўказанне канфіскоўваць хлеб, збожжа і муку, што прадавалі на базарах, і дармова здаваць у мясцовыя прыёмачныя пункты, якія выдавалі аб прыёме безграшовыя квітанцыі.

Усё гэта вымушала сялян ісці на крайнія меры. Многія ўласнаручна выразалі свойскую жывёлу — абы толькі не аддаваць яе ў калгас. Падпалы і іншыя дыверсіі ў калгасных гаспадарках сталі звыклай справай. У многіх раёнах, як, напрыклад, у Петрыкаўскім, узмацнілася агітацыя за распродаж жывёлы і маёмасці пад лозунгам «пі, прапівай, усё адно заганяць у калгас». Сяляне, не шкадуючы сваёй цяжкай працы, лічылі лепшым знішчыць свой набытак, чым абагульніць. Вось толькі адно роспачнае сведчанне селяніна-бедняка з Жыткавіч: «Я гараваў некалькі гадоў для таго, каб нажыць каня, здаў яго ў калгас сытым, а калі праз колькі дзён убачыў схуднелым (калі на ім вяртаўся з працы па лесавозках іншы), мне хацелася ўчапіцца за каня, і хай бы ён мяне забіў».

Кіраўніцтва краіны ніякім чынам не хацела прызнаваць немэтазгоднасць палітыкі гвалтоўнай калектывізацыі. Ва ўсіх няўдачах (а яны былі пастаяннымі, бо калгасы ствараліся без усялякага вопыту і ўцямных задач) яно вінавaціла «сабатажнікаў-кулакоў». Толькі наўрад ці тут варта было шукаць «кулацкі след». Людзі самі бачылі, да чаго вядзе жыццё ў калгасах. Таму па ўсёй краіне сталі выбухаць успышкі антыкалгаснага супраціву. Фактычна пачалася вайна сялян супраць калектывізацыі, і часам (асабліва ў хлебных раёнах) яна набывала крайне вострыя формы.

### ВІДОВІШЧА БЕЗ ХЛЕБА

Адным з буйных выступаў стаў жаночы хлебны бунт у Барысаве вясной 1932 года. Пасля абвяшчэння гарадскіх улад аб змяншэнні нормы выдачы хлеба і зняцця з цэнтралізаванага забеспячэння дзяцей рабочых і служачых 3-й катэгорыі (найменш важнай, з пункту гледжання дзяржавы) у Барысаве паўстаў стыхійны мітынг. Як сказана ў дакладной супрацоўніка ДПУ, 7 красавіка група жанчын «пры актыўным удзеле антысавецкага элемента» разграміла хлебную краму, а таксама два вазы з хлебам.

**У многіх раёнах, як, напрыклад, у Петрыкаўскім, узмацнілася агітацыя за распродаж жывёлы і маёмасці пад лозунгам «пі, прапівай, усё адно заганяць у калгас».**

Адметна, што разам з беспартыйнымі ў беспарадках непасрэдна ці ўскосна ўдзельнічалі і многія камуністы — ды яшчэ начальнікі. Напрыклад, загадчык новабарысаўскай хлебнай крамы ЦРК N 23, член КП(б)Б Рыгор Шлома, які «спакойна назіраў за тым, як жонка яго ўдзельнічала ў раскраданні хлеба». Або старшыня Барысаўскага ЦРК Разіна, які заявіў, што «і для яго незразумела, чаму няма хлеба, бо ў цэнтральных газетах ясна сказана, што збожжавая праблема ў асноўным вырашана».

У дакладной запісцы гаворыцца і пра бяздзейнасць міліцыі ў Барысаве. Зрэшты, асобныя міліцыянеры замест таго, каб заклікаць да парадку, самі вырывалі з рук работнікаў прылаўка хлеб і перадавалі жанчынам. Напрыклад, міліцыянер Прадзед, калі яму прапанавалі не дапускаць расхоплівання хлеба, заявіў: «Я сам галодны». Другі міліцыянер (прозвішча невядомае), падышоўшы да натоўпу жанчын, заклікаў іх дзейнічаць арганізавана. Абодва былі арыштаваныя.

Каб пазбегнуць разбірання хлеба на вуліцы падчас перавозкі ў крамы, на 8 красавіка ён быў дастаўлены туды ноччу. Аднак рабочыя не выходзілі на працу і ішлі на дэманстрацыі. Хваляванні сціхлі толькі 9 красавіка, калі аднавіліся пастаўкі хлеба, а норма выдачы яго дзецям была павялічана да 200 грамаў.



Так паказвалі становішча сялянскіх гаспадарак па абодва бакі мяжы.


Уборка бульбы ўручную ў адным з палескіх калгасаў, 1935 г.

### «УСЮДЫ АРУДУЮЦЬ БАБЫ»

Пачаліся самавольныя выхады з калгасаў. Прычыны іх па ўсёй рэспубліцы былі прыкладна аднолькавыя. Вось некаторыя сведчанні.

Серадняк з калгаса «Колас Калініна» Асвейскага раёна па прозвішчы Лебедзь казаў: «Працаваў я шмат, а атрымаў мала, не далі зусім ільну, хаджу без кашулі». Калгаснік Юхневіч, серадняк: «Я вазіў для МТС цэглу і бярвенне, калгас не запісаў мне працадзён і МТС таксама нічога не дала. У нас безгаспадарчасць і шкодніцтва, на 90 коней ёсць толькі 20 камплектаў збруі, і тая парваная. Пры такіх умовах я мушу прападаць з дзецьмі з голаду». Калгасніца Марыя Казакевіч: «У той час, калі калгаснікі ў цэнтры калгаса штодня атрымліваюць 5-6 літраў малака, у мяне няма каровы, я мушу хадзіць за два кіламетры па некалькі разоў выпрошваць малако. Старшыня калгаса хаваецца, і мы яго нідзе не бачым. Рахункавод калгаса, калі ўбачыў мяне басанож восенню ў холад падчас уборкі бульбы, сказаў мне: «Усе сабакі ходзяць босыя». Пры такіх умовах я жыць у калгасе не магу».

Па стане на 1 мая 1932 года колькасць гаспадарак, якія выйшлі з калгасаў, перавысіла 25 тысяч. Распаліся ўвогуле 57 калгасаў. Прычым, як адзначаецца ў дакладной запісцы сакратара ЦК кампартыі Беларусі Гікалы, гэтыя звесткі недакладныя, насамрэч развалаў і выхадаў было больш.

З дакладной сакратара Клімавіцкага раённага камітэта партыі Крыпца першаму сакратару ЦК КП(б)Б Шаранговічу, 13.07.1932 г., зусім сакрэтна:

«На 13.07 па раёне выйшла з калгасаў <...> усяго да 2000 двароў. <...> Самы працэс распаду пачаўся перш за ўсё па вёсках, якія мяжуюцца з Шумяцкім раёнам Заходняй вобласці, дзе з калгасаў выйшла 4000 двароў, прычым па нашай мяжы не засталося ніводнага ў іх калгаса. Пры распадзе ў нас асаблівую актыўнасць праяўляе кулак, цвярдзяк і, як правіла, яны ж з'яўляюцца зачыншчыкамі разбору калгаснай маёмасці, хоць самі ў калгасах не былі. Наогул распад калгасаў і разбор маёмасці суправаджаецца антысавецкімі выступленнямі <...>, а ў в. Дудараўка Галіцкага сельсавета была дэманстрацыя з белым сцягам і са спяваннем «беларускай марсельезы»... У пераважнай большасці выпадкаў работа па падрыхтоўцы разбору маёмасці калгаснікамі канспіруецца. Па размеркаванні абагуленай маёмасці часта ствараюцца свае «пяцёркі», камітэты і г.д.; як правіла, мужчыны ўбаку ад актыўнай работы і ўсюды арудуюць бабы».

Масаваму адтоку людзей з калгасаў паспрыяў голад ва Украіне 1932 — 1933 гадоў. У дакладной запісцы сакратару ЦК кампартыі ад сакратара Капыльскага РК Шпака паведамлялася: «Вялікую агітацыю распаўсюджваюць мяшэчнікі з Украіны, якія гавораць пра голад ва Украіне. Калі ўпаўнаважаны тлумачыць, што гэта няпраўда, што гэта кулацкая агітацыя, тады калгаснікі паказваюць на ўкраінцаў, што прыехалі з Кіеўшчыны, якія працуюць на будоўлі мастоў, і на мяшэчнікаў. Наплыў украінцаў-мяшэчнікаў вельмі вялікі». Якая гэта была «кулацкая агітацыя» свет даведаўся праз многія дзесяцігоддзі, калі былі рассакрэчаны матэрыялы пра ўкраінскі галадамор...

**Дзіяна СЕРАДЗЮК,**
*seradzyuk@zviazda.by*
**Вячаслаў СЕЛЯМЕНЕЎ.**

**Ілюстрацыі прадастаўлены Беларускім дзяржаўным архівам кінафотафонадакументаў**

■ Спорт-тайм

# Ні дня без медаля!

**У тыднёвым спартыўным аглядзе «Звязда» сочыць за медальнымі поспехамі беларускіх атлетаў на першых Еўрапейскіх гульнях, а таксама расказвае пра няпросты шлях беларускіх баскетбалістак у плэй-оф Еўрабаскета і новую клубную прапіску Артура Гаўруса.**

**1. Беларуская зборная** ўтрымлівае высокае чацвёртае месца ў медальным заліку на першых **Еўрапейскіх гульнях,** што праходзяць у Баку. На рахунку нашых атлетаў 40 узнагарод — 10 залатых, 9 сярэбраных і 21 бронзавая.

Два залатыя ў скарбонку беларускай каманды паклалі велагоншчыкі. Васіль Кірыенка быў самым хуткім у індывідуальнай гонцы з асобным стартам, а Алена Амялюсік выйграла групавую гонку на 120 км. Яшчэ адну ўзнагароду найвышэйшай якасці заваявалі беларускія гімнасткі. Нашы «мастачкі» выдатна выступілі ў практыкаванні з булавамі і абручамі і сталі першымі. Таксама на іх рахунку «бронза» ў шматбор'і. Адзначым, што яшчэ чатыры медалі зборнай прынесла Меліціна Станюта. Наша грацыя стала бронзавай прызёркай у шматбор'і, практыкаваннях са стужкай і булавамі, сярэбраным — у практыкаванні з абручом.

За «золата» Еўрапейскіх гульняў змагаўся і славуты беларускі тэнісіст **Уладзімір САМСОНАЎ.** У фінале ён вёў у ліку супраць чэмпіёна Еўропы Дзмітрыя Аўчарова з Германіі 2:0, 3:1, але ў выніку саступіў 3:4. «Да канца турніру набраў форму. У асабістым турніры гуляў значна лепш, чым у камандзе, — падзяліўся пасля вырашальнага матча Уладзімір Самсонаў. — Вядома, фінал хацелася выйграць, і былі добрыя шанцы. Ведаў, што сапернік здольны адыграцца. Шчыра кажучы, не ведаю, ў які момант упусціў гульню. У любым выпадку, «серабро» — гэта нядрэнны вынік».

**2. Жаночая зборная па баскетболе прабілася ў плэй-оф чэмпіянату Еўропы.** На другім этапе групавога раўнда падапечныя Анатоля Буяльскага пацярпелі тры паражэнні (ад чэшак, чарнагорак і францужанак), але дзякуючы вынікам іншых матчаў у групе B прайшлі далей. «Да старту чэмпіянату больш за ўсё я баяўся трох матчаў запар на першым этапе, — прызнаўся пасля матча з францужанкамі **галоўны трэнер зборнай Анатоль БУЯЛЬСКІ.** — Але мы выдатна з імі справіліся. Што датычыцца другога этапа: не магу сказаць, што ён быў правалены. Хоць і пацярпелі тры паражэнні, але кожны з матчаў мы прайгралі адным-двума кідкамі. Напэўна, не хапіла шанцавання, якога на старце турніру было з лішкам. У абароне дзяўчаты працуюць нядрэнна, а вось у нападзенні ёсць праблемы. Усё ж такі трэба рэалізоўваць свабодныя кідкі. Будзем над гэтым працаваць». Адзначым, што наша зборная толькі чацвёрты раз у гісторыі выйшла ў плэй-оф Еўрабаскета.

**3. На камандным чэмпіянаце Еўропы па лёгкай атлетыцы** ў Чэбаксарах зборная Беларусі заняла дзявятае месца і захавала прапіску ў Суперлізе. У суме беларускія спартсмены набралі 217 ачкоў. Пераможцам жа стала зборная Расіі (368,5), другое месца ў немцаў (346,5), трэцяе — у французаў (319,5). У другі дывізіён адпраўляюцца зборныя Швецыі, Фінляндыі і Нарвегіі.

**4.** У матчы **11-га тура чэмпіянату краіны па футболе** гродзенскі «Нёман» нарэшце спыніў безгалявую выязную серыю, перайграўшы брэсцкае «Дынама» — 3:1. «Мінск» у напружаным супрацьстаянні атрымаў перамогу над бабруйскай «Белшынай» (2:1). Вырашальны гол у дадатковы час з пенальці забіў Аляксандр Макась. А вось «Слуцк» і «Гомель» згулялі ў безгалявую нічыю.


**Больш чым палова ўзнагарод зборнай Беларусі на Еўрапейскіх гульнях — заслуга беларускіх спартсменак. Толькі Меліціна Станюта *(першая справа. — Аўт.)* заваявала чатыры медалі!**

**5. Беларускі хакеіст Артур ГАЎРУС** перайшоў у фінскі клуб «Спорт». Апошнія два сезоны выхаванец гродзенскага «Нёмана» выступаў у мінскім «Дынама». Вядома, што мінскі клуб збіраўся падаўжаць кантракт з форвардам, але Гаўрус вырашыў змяніць абстаноўку і паспрабаваць свае сілы ў іншым чэмпіянаце.

**Дарына ЗАПОЛЬСКАЯ.**
*zapolskaya@zviazda.by*